*Жыццядайнасць фальклору*



**Ірына МАЛАШУК**

Кандыдат філалагічных навук

# А на Купалу рана сонца іграла

Для беларусаў сёння прыярытэтныя такія каштоўнасці, як дзяржаўнасць, мова, уласная гісторыя, нацыянальныя традыцыі, звычаі, што садзейнічае фарміраванню ўяўленняў аб месцы і ролі народа ў сусветным гістарычным працэсе, станаўленні яго этнічных, а затым і нацыянальна-культурных асаблівасцей у кантэксце сусветнай цывілізацыі. Адзін з важнейшых сродкаў асэнсавання гэтага — даследаванне народных звычаяў і абрадаў.

Паходжанне каляндарных і сямейна-бытавых абрадаў і цыклаў песень, якія спадарожнічалі ім, бясспрэчна, ідзе ад глыбокай старажытнасці, калі першабытны чалавек розныя сілы і з'явы прыроды адухаўляў і імкнуўся ўступаць з імі ў непасрэдныя зносіны. Нашы прашчуры абрады суправаджалі песняй або наборам простых рытмічных слоў, якія па-свойму тлумачылі змест і парадак розных дзеянняў, што ўваходзілі ў абавязковы табуіраваны пералік. Абрад надаваў песні асаблівую ўстойлівасць, прыводзіў да варыянтнасці, у сувязі з чым песня магла захоўвацца і перадавацца словам з пакалення ў пакаленне на працягу стагоддзяў.

У рэлігійных вераваннях беларусаў доўгі час захоўваліся старажытныя, традыцыйныя ўяўленні, якія прасочваюцца ў поглядах на сусвет, прыроду, на адносіны чалавека з навакольным светам. Асабліва шанавалася сонца: «цар неба», «божае вогнішча» (бог агню). На сонца, як на боства, нельга было злавацца, рабіць адносна яго нешта непрыстойнае... Да яго звярталіся з просьбай аб здароўі і дабрабыце *[4. С.444]*.

## Ян, Янус, Купалле...

Сонца лічылася галоўным боствам, таму час яго «памірання» і «ажывання», а разам з тым і ўсёй прыроды пакладзены ў аснову язычніцкіх свят. Яны групуюцца вакол зімовага і летняга сонцаваротаў. Надыход лета, яго апагей у каляндарна-абрадавым фальклоры звязаны з адным з самых старажытных свят салярнага рада — Купаллем. Купальская абраднасць даволі складаная і вельмі цікавая. Сведчанне старажытнасці

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ае — распаўсюджанасць не толькі сярод іншых славян, але і неславянскіх народаў Еўропы. Многімі даследчыкамі Купалле таксама звязваецца не з адным салярным культам, але і з культам вады і расліннасці. «Асноўным усё ж такі застаецца Сонца, бо росквіт расліннасці і ўсіх сіл зямлі нанрамую залежыць ад Сонца. Тыя ж вянкі, якія дзяўчаты пускаюць у ваду,— гэта таксама сімвалы сонца» *[7. С. 87]*.

Свята Купалы бярэ пачатак ад яшчэ аднаго Яна. «Ян (Яна) — старажытнейшы культ сонечнага святла, сонца. Першапачаткова яго шанавалі як апекуна цяпла і жыцця. Гэты вобраз і свята былі прынесены ў Еўропу старажытнымі жывёлаводамі-лацінамі з Азіі (у Паўднёва-Усходняй Азіі захаваліся архаічныя вобразы багоў над назвай “Ян”, “Янь” — “гаспадароў” водных крыніц. Старажытнарымскі “Янус” захаваў функцыю стваральніка рэк і ручаёў, падаўцы сонечнага святла. Пад уплывам хрысціянства яго пачалі называць “Іаанам Хрысціцелем”» *[16. С. 209—210]*.

Старажытныя рымляне святкавалі дзень Януса ў час зімняга сонцавароту (крыху пазней і месяц быў названы «январь»). Сучасныя італьянцы здзяйсняюць абрад у гонар Януса ў час летняга сонцастаяння — 24 чэрвеня і называюць свята Іаанам Хрысціцелем. Адсюль вынікае, што архаічны Ян (Янус) святкаваўся старажытнымі жывёлаводамі двойчы на год — на летняе і зімняе сонцастаянне, а славяне заназычылі толькі летняе свята Яна (24 чэрвеня), у большай ступені звязанае з земляробствам, пра што сведчаць абрады падскоквання «на доўгі лён» (у чэхаў і славакаў), абыход ворнай зямлі з плугам, абрадавая ежа з ячменнага зерня. Старажытныя славяне, якія жылі на Дунаі — радзіме праславян — побач з лацінамі, зберагл архаічную назву свяшчэннага вобраза — Ян. Нават пасля рассялення яна захавалася ў чэхаў, славакаў, палякаў і лужычан. Ва ўсходніх славян свята называлася «Іван», аднак у абрадавых купальскіх песнях часта выконваўся прыпеў-канцоўка: «Яна, Яна, Яна». У палякаў і ўсходніх славян захаваўся найбольш архаічны звычай узбірацца на пагоркі пасля купальскай ночы і адтуль глядзець на ўзыходзячае сонца і на яго «ігру», славячы штогадовы прыход нябеснага свяціла.

Паводле народнага павер’я сонца на Купалле ўзыходзіць не проста «выглядваючы», а іграючы — распадаецца на некалькі дыскаў, якія то разбягаюцца ў розныя бакі, то злучаюцца, прадказваючы добры ўраджай. Гэта старажытнае ўяўленне знайшло адбітак у тыповых купальскіх песнях, адметная рыса якіх — паэтызацыя буяння летняй прыроды, маладосці, проста радасная карнавальнасць у спалучэнні жыцця і працы, прыроды і сонца: «А на Купалу // Рана сонца іграла — // Рана сонца іграла // На добрыя годы, // На цёплыя росы — // На цёплыя росы, // На хлябы ўраджаі — // На хлябы ўраджаі» *[15. С. 191]*.

Асаблівае значэнне купальскай абраднасці абумоўлівалася часам, у які яна здзяйснялася. «Падчас летняга сонцастаяння сонца дасягае свайго апагею: у гэты дзень яно павінна быць самым гарачым, таму людзі стараюцца захавацца ад яго праменяў і адначасова выкарыстоўваць гэтую энергію ў побытавых мэтах. Прырода ў гэты час знаходзілася ў найвышэйшым росквіце» *[20. С. 141]*, пачыналася выспяванне пладоў, набліжалася жніво. «Выдзяленне расліннасці, надзяленне яе ў іванаўскую ноч цудоўнымі ўласцівасцямі было, безумоўна, звязана з тым, што гэта быў перыяд яе найвышэйшага росквіту, цвіцення. Менавіта таму днём ці вечарам пад Івана Купалу збіралі паўсюдна травы — гаючыя і чарадзейныя — для варажбы» *[21. С. 229]*. М. Нікольскі, адзначаючы старажытнасць гэтага абраду, адносіць яго да эпохі «збірання карысных раслін» *[18. С. 34]*. У адной з купальскіх песень адзначаецца чароўнае ўздзеянне, магічная ўласцівасць «зелля», напоўненага сонечнай вылячальна-гаючай сілай: «На Купалле, на Яна, // Девочка зелье зберала: // Яна зберала, ня знала; // Да до Королеўны послала; // Королеўна зелье познала, // Да ўсем девочкам сказала: // Гето девоцькая красота, // А дятюшковая сухота; // Гето девоцькая умыванья, // А дятюшковая ўздыханья» *[5. С. 44]*.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

Іванаўскімі травамі абкурваюць таксама хворых людзей і жывёлу, падчас навальніцы зелле кідаюць у запаленую печ, вешаюць пад страхой хаты, у хлявах. З даўніх часоў нейкая канкрэтная расліна-кветка звязвалася ў міфалогіях народаў свету розным язычніцкім боствам. «Напрыклад, мята і блёкат прысвечаны Юпітэру; цыбуля, гарчыца, малачай — Марсу; сланечнік, півоня, падтыннік, грэчка — Сонцу... Больш агульнае суаднясенне прынята наступнае: плады — Юпітэр, кветкі — Венера, насенне і кара — Меркурый, карані — Сатурн, сцябло — Марс, лісце — Поўня, уся расліна цалкам — Сонца» *[19. С. 44]*.

Купальскі культ прысвячаўся не толькі пакланенню сонцу, але і шанаванню раслін, якія ў гэты перыяд валодаюць асаблівай сілаю, што можа быць «амбівалентна і гаючай, і знішчальнай» *[12. С. 29]*.

## Папараць-кветка як сімвал шчасця

Ноч з 23 на 24 чэрвеня (паводле старога стылю) лічылася самай таямнічай у свядомасці нашых продкаў. Згодна паданню акурат на Івана Купалу расцвітае цудоўнай агнявой кветкай папараць, і таму, каму пашчасціць яе знайсці, адкрыюцца ўсе схаваныя глыбока пад зямлёю скарбы, ён стане багатым, моцным, пачне разумець мову жывёл і птушак. Пад папараццю, зразумела, маецца на ўвазе золата. Але адзначым і тое, што міфічная кветка малявалася нашымі продкамі абавязкова падобнай на само сонца. «Як Купала сама ўся ў золаце, на залатым прастоле, так і ў яе просяць таго ж: яна падае ў сваю, Купальскую, ноч, праз яго здабываюць багацце ўсяго свету, робяцца панамі, валодаюць светам і пакояцца, як і сама вогненнакосая Купала: "Купала наша, Купала! // Дай нам котлы золота! // Вот солодушка цветет; // Я ўсяду пры ней, // Проночую пры ней, // Подстерегу красочку // Сорву папыротку. // Буду богач-богатыр: // Закуплю я весь свет, // Ня пойду я на прыгон // І буду спать у клеті, // Лепшы мойго пана!"» *[5. С. 45]*.

Аднак здабыць папараць-кветку вельмі цяжка. У самую поўнач адбываецца страшэнная навальніца, зіхаціць маланка («міфічная сцэна палявання маланак-перуноў на ўсялякіх нячысцікаў» *[17. С. 146])*, паказваюцца розныя здані-пачвары, каб перашкодзіць гэтаму. Той, каму б пашчасціла сарваць яе, павінен, не азіраючыся, спяшацца дадому, не звяртаючы ўвагі ні на пагрозы, ні на прывабныя абяцанні, якімі ведзьмы і д'яблы імкнуцца прымусіць азірнуцца. Калі гэта адбудзецца, кветка імгненна знікне або чароўная сіла яе сонечнай энергіі пяройдзе да нячыстай сілы.

Мікалай Нікольскі адзначыў, што культ папараці «няясны, але вельмі распаўсюджаны» *[18. С. 34]*. У Беларусі найбольш поўна з усіх славянскіх народаў захаваліся водгаласы самай сівой даўніны і ў гэтым абрадзе ўрачыстасці, і ў песнях, што яго суправаджаюць. Своеасаблівы каларыт паэзіі Купалля надала не толькі яе адметная функцыянальная скіраванасць, зместавая напоўненасць, але і адпаведная паэтыка, асобныя элементы якой трансфармавалі ў сабе рэаліі летняй прыроды — пары найвышэйшага яе росквіту. Тыповы для купальскіх песень рэфрэн «Сонейка, сонейка» як бы «апаясвае» ўвесь твор, узмацняючы кожны радок паасобку і сам тэкст эмацыянальна, і паглыбляючы яго магічнае ўздзеянне на слухачоў: «Сонейка, сонейка, // Ян з Пятром ходзяць, // Сонейка, сонейка, да па межах ходзяць, // Сонейка, сонейка, да жыта глядзяць. // Сонейка, сонейка, да ідучы гаварылі: // Сонейка, сонейка, усё жыта добрае...» *[3. С. 188]*.

Нельга не пагадзіцца, што «ў святле бясконцай эвалюцыі людской цывілізацыі, чалавечага мыслення не выглядае чыстай фантазіяй дапушчэнне, што рэфрэн «Сонейка, сонейка» — трансфармаваны зварот чалавека ранніх грамадскіх формаў да нябеснага свяціла. Той факт, што слова «сонейка» служыла і зачынам песні, арганізоўвала ў тэксце цэлы анафарычны рад, умацоўвае... у верагоднасці такога меркавання» *[10. С. 44]*. У глыбокай старажытнасці словам, абрадавай песняй спадзяваліся ўздзейнічаць на аб'ект звароту (у дадзеным выпадку

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

гэта сонца), чакалі рэальнага плёну не толькі ў выглядзе ўраджайнасці, але і шчасця ў каханні: «Сонейко. Пятрова ночка, дзе твая дочка? Сонейко. // Сонейко. Там у лесе начавала. Сонейко. // Сонейко. Начавала, зелле збірала. Сонейко. // Сонейко. Там начлежнікі начавалі. Сонейко. // Сонейко. Начавалі дай агонь клалі. Сонейко. // Сонейко. Агонь клалі дай гаварылі. Сонейко. // Сонейко. Паедзем хлопцы жаніціся. Сонейко. // Сонейко. Жаніціся ў ягадзень. Сонейко. // Сонейко. Усе харошыя, усе прыгожыя. Сонейко» *[3. С. 195]*.

Таксама цікавы прыклад, у якім гучаць матывы кахання, шлюбу, асвечанага святлом сонца, «іграючага» на Яна (гэта назва боства сведчыць пра старажытнасць фальклорнага твора), знаходзім у П. Шэйна: «Сонейко, чему Янова ночка не велічка. // Сонейко, сонейко, бо ты рано ўсходзіш. // Сонейко, сонейко, рано ўсходзіш да іграючы, // Сонейко, сонейко, іграючы, Яна звелічаючы. // Сонейко, сонейко, дзевунька да не выспаласе. // Сонейко, сонейко, шнуре вязала, // Сонейко, сонейко, шоўковые, // Сонейко, сонейко, да едвабные. // Сонейко, сонейко, сему, тому продавала, // Сонейко, сонейко, свойму мілому да даровала. // Сонейко, сонейко, сему, тому по тры грошы. // Сонейко, сонейко, свойму мілому, што найхорошы» *[22. С. 154]*.

У старажытным светасузіранні ў адзінае цэлае звязваліся ўяўленні аб сонцы як пачатку ўрадлівасці, з аднаго боку, і кахання — з іншага. Бясспрэчна, што гэтая сувязь усталёўваецца праз аналогію паміж урадлівасцю зямлі і дзетанараджэннем. Такім чынам, у абрадах святкавання Купалы захаваліся сляды любоўнага культу. Прыгадаем, што ў язычнікаў гэтая ноч была перыядам «умыкання жонак». Можна адзначыць сярод купальскіх цэлы шэраг песень, у якіх усхваляюцца каханне і шлюб: «...Сонейка на заходзе. // Была ў мамачкі адна дачушка. // І тая на выходзе» *[3. С. 219]*; «Ды на полі ліпа з сонейкам йграець... Рана, рана, Малады маладзец коніка сядлаіць...» *[3. С. 234]*; «Дунай з морам паспіраліся // А за дзеваньку сіроціньку. // Мора кажыць: “Я яе ўтаплю // Гэту дзеваньку сіроціньку”, // Дунай кажыць: “Валной выкіну // Гэту дзеваньку сіроціньку”. // Сонца кажыць: “Я яе высушу // Гэту дзеваньку сіроціньку”... А Бог кажыць: “Я ёй долю дам // Гэтай дзеваньцы сіроціньцы” *[3. С. 245]*.

Як бачна, у гэтых песнях значнае месца адводзіцца сонцу, якое спрыяе закаханым, прадказвае хуткі шлюб. На такую акалічнасць звяртаў увагу і Я. Карскі: «Падобны погляд на стан сіл прыроды ў перыяд летняга сонцастаяння ўласцівы... і іншым еўрапейскім народам. Паўсюдна з Іванавым днём злучана шмат абрадаў, якія паказваюць на павелічэнне сваяцкіх сувязей, хаця б падчас і знешніх (кумаўство, братанне), павелічэнне прадукцыйных сіл прыроды праз шлюб і іншыя падобныя адносіны» *[8. С. 290]*. Паколькі менавіта жанчына сімвалізуе сабою пачатак жыцця на зямлі, тут таксама можна прасачыць суаднясенне з сонцам, у тэкстах купальскіх песень значнае месца адводзіцца вобразу дзяўчыны і маці: «млада Купалінка», «сястрыца», «дзеўка добрая Алеся», і само купальскае боства паўстае ў вобразе жанчыны — «Купала Маці ці дачка яе» *[5. С. 44]*.

Цікавае параўнанне маці з сонцам назіраецца ў песні «А я дзеўка добрая Алеся...»: «...Мой бацька — ясны месяц, // Мая маці — краснае сонейка, // Мае браты — ў саду салавейкі, // Мае сёстры — ў жыце перапёлкі» *[3. С. 194]*. Такое параўнанне сустракаецца і ў велічальных калядных і валачобных песнях. Аднак нельга атаясамліваць гэтыя абрады, бо ў кожнага свае адметныя рысы. На гэту акалічнасць звяртае ўвагу З. Мажэйка: «Як і ў перыяд зімняга сонцавароту (“на Каляды”), у перыяд летняга сонцавароту (“на Купалле”) у поўнай меры дае аб сабе знаць карнавальнасць светаадчування “песеннай абшчыны”. Укаранелая ў народзе прымаўка «на Купала што зрабіў, тое прапала» прама пераклікаецца з дзеяннямі “шыварат-навыварат” у калядныя крывыя вечары. У старажытныя часы моманты карнавалізацыі ў купальскай абраднасці маглі прымаць і оргіястычны характар, аб чым сведчаць і многія летапісныя крыніцы. Будучы падобнымі па сутнас-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ці, гэтыя старажытныя святкаванні сонцаваротаў, аднак, адрозніваюцца па характару суадносін іх кампанентаў. Калі на Каляды абрадавы, песенны і карнавалізаваны бакі ідуць адным непадзельным патокам, то на Купалле ўласна карнавалізацыя, з аднаго боку, і песенная абрадавасць — з другога, праходзяць як бы паралельна» *[12. С. 30]*.

## Вогнішча — культ агню

Праўдзівае яшчэ адно сведчанне таго, што «калі ў абрадава-гульнявых дзеях каляднага часу антынарматыўнасць выступае іх дамінантнай адзнакай, то ў перыяд летняга сонцавароту антынарматыўны комплекс паводзін найбольш яскрава раскрываецца ў рытуальна-гульнявых купальскіх бясчынствах» *[6. С. 24]*. Купальскія песні як неад'емны кампанент абраднасці выконваюцца галоўным чынам ноччу. Вакол вогнішча вадзілі карагоды, напэўна, у іх можна бачыць імітацыю руху сонца, а вогнішча ў свядомасці старажытных атаясамлівалася не проста агнём, а свяшчэнным, які сімвалізаваў само сонца. Вогнішчы запальваліся яшчэ і ў гонар старажытнага Яна. «Абраднасць запальвапня святаянскіх агнёў, карагоды дзяўчат вакол вогнішчаў, пераскокванне праз іх юнакоў і дзяўчат складалі выключна абраднасць моладзі, звязаную з пасвячэннем у разрад дарослых. К XX ст. яны ператварыліся ў гульню моладзі, аднак у II—I тыс. да н. э. яны з'яўляліся састаўной часткой свята Яна. Да гэтага часу вобраз прамяністага Яна (падаўца святла) набывае функцыю апекуна кахання і шлюбу (дзяўчыны варожаць аб сваіх жаніхах). Ян уяўляўся заступнікам першых знаёмстваў і сяброўства дзяўчын і хлопцаў, іх дашлюбнага становішча ў якасці "жаніха" і "нявесты". Аднак фарміраванне шлюбу і іх сямейных узаемасувязей адбывалася толькі ў час святкаванпя зімовага Яна (у студзені). Значыць, летні Ян (24 чэрвеня) з'яўляўся перыядам знаёмстваў... І толькі выключэннем у знаёмствах з'яўляліся тыя пары жаніхоў і нявест, якія запэўнівалі адзін аднаго клятвамі ў чыстасардэчнасці сваіх намераў ажаніцца ў студзені. Яны, насуперак традыцыі, пачыналі свае шлюбныя ўзаемасувязі ў час правядзення летняга Яна.

Абрад пераскоквання цераз агонь святаянскага вогнішча імітаваў старажытную перадшлюбную традыцыю жывёлаводаў-індаеўрапейцаў — пачатак праходжання пасвячэння ў разрад дарослых у іх свяцілішчах-храмах... У свяцілішчах усіх дзяўчын называлі "янінамі", а хлопцаў — "янамі". Пазней гэтыя агульныя назвы ператварыліся ва ўласныя імёны» *[15. С. 210—211]*.

Паводле П. Шэйна ў мястэчку Іванава ў купальскім вогнішчы спальваліся ўсе старыя, не патрэбныя ў гаспадарцы рэчы: «рваныя анучы, лапці, боты, шапкі, армякі, збруя і нават калёсы» *[23. Т. 1. С. 221]*. Такім чынам адбывалася падтрымка пачынаючай згасаць энергіі прыроднага свяціла пры дапамозе агню. Няцяжка прасачыць, як магічнае дзеянне ачышчэння ім сімвалізуе яркае моцнае сонца, а тое, у сваю чаргу, атаясамлівалася з багаццем і шчасцем.

Указанне на спалучэнне сонца, Купалы і агню назіраецца ў адной з песень: «Я зёлкі ў полі сбіраю. // Івана Купалку піраймаю // І ўсё гляжу ў цёмен лес. // А ў цёмным лесі огонь горіць, // Кылы огня Купалка сядзіць, // Купалка сядзіць і ў голос плачець. // — Чаго, чаго, Купалка, плачешь? // Ті табе тут соўнінька мала? // — Ох, ні мала мне яспаго соўнінька. // Тут досыць мне ўсяго, ўсяго! // І Плачу я того, того, // Што міне людзі ні так піраймаюць. // Только то й робяць, // Што огні раскладаюць» *[23. Т. 1. С. 149]*.

Гэты сюжэт не выпадковы, таму што «жыццё» вышэйшай істоты Купалы, як уяўлялася яна язычніцкаму старажытнаму вераванню, а іменна: «згараючай агнём (кахання, рэўнасці і іншых моцных чалавечых пачуццяў)» *[5. С. 46]*, заканчваецца. Яно згасае, як патоплены ў вадзе (вільгаці) агонь, або тое ж жыццё працягваецца «купаннем» полымя. Калі жыццё Купалы згасае, агонь патрэбна затушыць. «Рытуальнае тушэнне вогнішчаў упісваецца ў рытуальную сістэму — гэтым кладзецца канец існуючым "формам", расчышчаецца месца для з'яўлення

Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова

новай формы» *[11. С. 108]*. П. Бяссонаў адзначаў: «Моладцы самі не справяцца з агнём: патушыць павінны дзяўчаты... Моладцы ашукваюць, носяць ваду рэшатамі... Дзяўчаты ж носяць ваду кубачкамі, катламі і вёдрамі...» *[5. С. 47]*.

Тут у пэўнай ступені прасочваецца перамога жаноцкага пачатку над мужчынскім. Жыццядайнасць жанчыны суадносіцца з сонцам, у гонар якога і ладзіцца свята. Калі ж жыццё Купалы працягваецца праз «купанне» полымя, тады вогнішчы не тушаць, а пускаюць іх па вадзе на плытах, або назіраецца трансфармацыя, як бы перараджэнне полымя ў ваду. Адна адвечная, «даючая жыццё» стыхія пераходзіць у іншую: «У пана Івана, // Посередь двора, // Стояла верба, // На вербі горілі свічі, // С той вербы // Капля упала, // Озеро стало» *[14. С. 46]*. Напэўна, такая вада набывае асаблівыя ўласцівасці, таму што яна ачышчаецца агнём, народжаным сонцам, якое дасягае свайго апагею ў момант летняга сонцастаяння. Як сцвярджае Т. Агапкіна, «у Іванаў дзень адбываецца асвячэнне вады святым Янам, пасля чаго з вады знікаюць дэманы... Сярод цудоўных з'яў найбольш папулярныя павер'і аб пераўтварэнні вод (у рэках, азёрах і крыніцах) у віно... Адпаведна былічкам, чалавек імкнецца ўбачыць гэту з'яву, для чаго накіроўваецца ноччу да ракі ці возера. Чалавек, які ў купальскую ноч выпіў гэтае віно ці заспеў сам момант пераўтварэння вады ў віно, можа разлічваць на здзяйсненне загаданых ім у той момант жаданняў» *[1. С. 562—563]*. Не дзіўна, што такія ачышчальна-цудоўныя пераўтварэнні вады пад уздзеяннем агню і сонца маюць агульнаславянскі характар.

Зінаіда Мажэйка па-свойму пацвярджае гэта: «Культ агню, як сімвалічнае ўвасабленне сонца і галоўны элемент магічнай падсістэмы, настолькі трывала ўкараніўся ў беларускай купальскай абраднасці, што і самі вогнішчы (якія паляць не толькі на Купалу, але і ў другі час, як, напрыклад, на Пасху ў палескай традыцыі) у асобных раёнах прынята называць купалай, што знаходзіць адлюстраванне і ў тэкстах купальскіх песень:

Ой, молодая молодыца,
Ой, выйдзі, на юліцу,
Разведзі дзеўкам купайліцу...» *[13. С. 29]*.

Агонь паўставаў у салярна-аграрных святах не толькі знакам сонца, яго зямным падабенствам, але, канешне ж, выконваў і іншыя функцыі. Яму, як і вадзе, прыпісвалі магічныя ачышчальныя ўласцівасці. Але ж абараняльная, агароджваючая сіла сонца і агню распаўсюджвалася і на праявы нячыстай сілы: каб перагарадзіць ёй уваход у хату ці ў двор, паселішча абыходзілі з агнём, запальвалі вогнішчы, каб запалохаць ведзьмаў, кідалі ў іх галавешкі. На гэтую акалічнасць звяртае ўвагу і А. Афанасьеў: «...магічна-традыцыйным дзеяннем агню і вады праганяюць прэч ад чалавека цёмныя, варожыя, дэманічныя сілы; пазней абрад гэты атрымаў значэнне духоўнага ачышчэння ад грахоў...» *[2. С. 99]*.

«Разам з іншымі аграрна-магічнымі сродкамі агню прыпісвалі ўласцівасць павышаць ураджайнасць — вогнішчы палілі часам на жытнім полі ці каля яго, галавешкі ад іванаўскіх вогнішчаў кідалі на нівы і ў агароды. У пераскокванні праз вогнішчы парамі можна ўгледзець ужо сляды шлюбнай магіі. Пра былое важнае культавае значэнне агню гаворыць звычай, што захоўваўся яшчэ дзе-нідзе да XX ст., здабываць агонь для абрадавых дзеянняў і вогнішчаў старажытным спосабам — трэннем (такі агонь называлі "жывым")» *[21. С. 266]*. У некаторых месцах спальвалі дошкі з разбітых бочак, кублоў, вёдраў, іншага дамашняга драўлянага посуду.

Акрамя вогнішча адным з элементаў сонечнага культу быў і салярны знак — кола, пасаджанае на жэрдку, каб высока гарэла. Як трапна адзначыў А. Афанасьеў, «І кола і полымя — сімвалы сонца. Адыходзячы на зіму, яно страчвае свой яркі бляск, становіцца бледным, што і працягваецца да той пары, пакуль са зваротам вясны ні выкупаецца яно ў дажджавой вадзе: толькі тады стане сонца «краснае» і заблішчыць на небе залатым чырвонцам. Паэтычнае ўвасабленне сонца з вогненным колам выклікала звычай запальваць у вядомыя гадавыя святы колы — звычай, што да гэтага часу захоўваецца паміж нямецкімі і славянскімі



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

пляменамі... У некаторых мясцовасцях Маларосіі існуе звычай, які заключаецца ў тым, што на свята Купалы адкочваюць ад запаленага вогнішча кола, адлюстроўваючы такім сімвалічным знакам паварот сонца на зіму. Тое ж перадавалася і... скочваннем вогненнага кола ў раку: пасля павароту свайго летняе сонца пачынала спускацца з вяршыні нябеснай гары, і гарачыя прамяні яго таксама тушыліся ў дажджавых струменях надыходзячай восені, як полымя спушчанага з гары кола памірала ў хвалях ракі» *[2. С. 210—212]*.

■

Магічна-традыцыйнымі дзеяннямі чалавек намагаўся паўплываць на сілы прыроды. Тым самым ён выступаў як актыўны пачатак, а не ахвяра дзеянняў незразумелых яму прыродных з'яў. Відавочна, што з рэліктаў купальскіх абрадаў можна вызначыць вобраз Купалы-Яна як крыніцы сонечнага святла, пораў года, апекуна земляробства і жывёлагадоўлі, кахання і шлюбу, заступніка насельнікаў свяцілішчаў. Купальская абраднасць з'яўляецца адэкватнай формай выяўлення першавобраза сонца, які рэалізуецца ў часавай прасторы (гэта быў самы доўгі дзень і самая кароткая ноч), у традыцыйным абрадзе сустрэчы свяціла, якое, паводле народнага ўяўлення, своеасабліва ўзыходзіць («грае»), ва ўяўленнях аб звышнатуральных уласцівасцях раслін, што найбольш ярка ўвасабляюцца на прыкладзе папараць-кветкі, у сімвалічным салярным напаўненні вобраза агню, яго ачышчальных функцыях.

ЛІТАРАТУРА

1. Агапкина Т. А. Мифологические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл. М., 2002.

2. Афанасьев А. Н. Поэтические воззрения славян на природу: В 3-х т. М.: «Индрик», 1994—1995.

3. Беларускі фальклор. Хрэстаматыя / Скл. К. П. Кабашнікаў і інш. Мн.: Выш. школа, 1996.

4. Беларусы: У 8-мі т. / Рэд. В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, В. С. Цітоў. Мн.: Навука і тэхніка, 1995. Т. 1. Прамысловыя і рамесныя заняткі.

5. Бессонов П. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества, языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта. М., 1871.

6. Бяркові ч Т. А. Песенна-гульнявыя дзеі перыяду сонцавароту ў каляндарна-земляробчай традыцыі Беларусі: Аўтарэф. дыс. ... канд. мастацтвазнаўства: 17.00.04. Мн., 1999.

7. Казакова І. В. Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыялах беларускага фальклору). Мн.: «БОФФ», 1999.

8. Карскі Я. Беларусы. Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001.

9. Кацар М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / Рэд. Я. М. Сахута. Мн.: БелЭН, 1996.

10. Ліс А. С. Песню — у спадчыну: Мастацтвазнаўчыя артыкулы. Мн.: Маст. літ., 1989.

11. Лосев А. Ф. Античный космос и современная наука. М., 1927.

12. Мажэйка З. Я. Народна-песенная культура Беларусі ў агульнаславянскім кантэксце / [XII Міжнародны з'езд славістаў]. Мн.: Інстытут МЭФ, 1998.

13. Мажэйка З. Я. Песні беларускага Паазер'я. Мн.: Навука і тэхніка, 1973.

14. Малевич С. Белорусские народные песни. С-Пб., 1907.

15. Мирочников Л. Т. Словарь славянской мифологии. Мн.: НИО, 1999.

16. Мифологический словарь / М. Н. Ботвинник, М. А. Коган, М. Б. Рабинович, Б. П. Селецкий. Мн.: Университетское, 1989.

17. Ненадавец А. М. Святло таямнічага вогнішча. Мн.: Беларусь, 1993.

18. Никольский Н. М. Дохристианские верования и культы днепровских славян. М.: Атеист, 1929.

19. Природа исцеляющая. Астрологический травник / Авт.-сост. Т. В. Семенова. Мн.: «Сэр-Вит», 1994.

20. Смирнов В. А. Купальская обрядовая поэзия восточных славян: Автореф. дис. ... канд. филолог. наук: 10.01.09. М., 1978.

21. Соколова В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов, XIX — начало XX в. М., 1979.

22. Шейн П. В. Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями. С-Пб., 1874.

23. Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края // Сб. Отделения русского языка и словесности АН. С-Пб. 1887—1902. Т. 1—3.

Бабруйск

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова